## РЫЗЫКУЮЧЫ ЖЫЦЦЁМ

### Аб гераічным учынку жыхароў в. Карпаўцы

...Было гэта ў першыя дні Вялікай Айчыннай вайны. Нашы войскі адступалі. На асобных участках фронту адступалі беспарадкава, пакідаючы тэхніку і нават цяжка параненых байцоў. Гітлераўцы, якія прайшлі амаль што трыумфальным маршам па краінах Заходняй Еўропы, не хацелі абцяжарваць сябе палоннымі. Яны расстрэльвалі іх цэлымі групамі. У гліняным кар'еры, што каля вёскі Карпаўцы, фашысты забілі больш дваццаці чырвонаармейцаў. Жорстка распраўляліся з мірнымі жыхарамі, тымі, хто даў адступаючым напіцца вады ці кавалак хлеба. У двары Аляксандра Хамяні засталі двух чырвонаармейцаў – расстралялі салдатаў і гаспадара.

Асобныя адносіны былі ў фашыстаў да савецкіх камандзіраў. У ваколіцы Карпаўцаў яны захапілі 16 чырвонаармейцаў на чале з афіцэрам. Радавых адвялі ў кар'ер і расстралялі, а над афіцэрам рашылі перад смерцю наладзіць экзекуцыю. Жыхароў Карпаўцаў – і старых і малых – выгналі за вёску, загадалі ўсім сесці на зямлю і трымалі іх пад дуламі аўтаматаў. Потым прывялі савецкага афіцэра, далі яму лапату і загадалі капаць магілу. Калі яма паглыбілася дзесьці на паўметры, выцягнулі афіцэра з яе і паставілі тварам да натоўпу. Афіцэр мужна прымаў смерць. Гітлеравец не вытрымаў яго погляду і загадаў павярнуцца спіной. Шчоўкнуў затвор, раздаўся выстрал і афіцэр мёртвым упаў у яму. Гітлераўцы яшчэ некаторы час трымалі сагнаных людзей. А людзі чакалі смерці... Нарэшце паступіла каманда адпусціць заложнікаў. Вось так фашысты выхоўвалі ў мірных людзей павагу да новай улады. Але ім не ўдалося ўсіх запалохаць. Адправіўшыся ад перанесенага стрэсу, праз дзень вяскоўцы пачалі гаварыць, што трэба больш – менш па-людску пахаваць расстраляных. Новая ўлада на такое не дасць дазволу. Значыць, трэба рабіць употайку. Зрабіць гэта выклікаўся падлетак Сцяпан Валько, не па гадах кемлівы, разважлівы і смелы. Жыццё зрабіла яго такім. У бацькоў сям'я была вялікая: шасцёра дзяцей, а зямлі – усяго толькі адна дзесяціна. Каб пракарміць сям'ю, дарослыя браты і сёстры ўвесь час парабкавалі. Не было сапраўднага дзяцінства і ў Сцяпана. З маленства ён пасвіў чужых кароў і авечак.

З дазволу бацькі Сцяпан запрог каня і цэлы дзень з дапамогай другіх адкопваў і перавозіў на старыя могілкі забітых, дзе яны і былі пахаваны ў брацкай магіле. Сцяпан, як і яго сям'я, верыў, што фашысцкай навале прыйдзе канец. Яму хацелася ведаць, адкуль гэтыя людзі, каб потым паведаміць пра іх лёс родным і блізкім. Ён знайшоў у кішэнях забітых запісныя кніжкі, іншыя дакументы, а ў афіцэра – і партыйны білет. Ён ведаў, што гэта за чырвоная кніжка і як аднясуцца да яе фашысты. Сцяпан хуценька, каб ніхто не бачыў, паклаў дакументы сабе ў кішэню, а дома схаваў у надзейным месцы да часу вызвалення, рызыкуючы не толькі сваім жыццём.

Сям'я Валько была на асобым уліку ў новай улады. Старэйшы брат Аляксей партызаніў, Юліка ў час аблавы немцы злавілі і адправілі на прымусовыя работы ў Германію. У час гэтай аблавы трапіў у рукі немцаў і Сцяпан, але па просьбе бацькоў солтыс заступіўся і яго не забралі ў няволю, затое да прыходу савецкіх войск ён працаваў у солтыса. Сёстры ўвесь час хаваліся, каб не трапіць у рукі акупантаў і іх памагатых.

І вось настаў доўгачаканы дзень вызвалення. Большасць мужчын вёскі забралі на фронт… Пасля вызвалення ваяваў з фашыстамі і Юльян Валько, дамоў вярнуўся інвалідам. Пяцёра жыхароў вёскі Карпаўцы загінулі смерцю храбрых, вызваляючы народы Заходняй Еўропы ад фашысцкай чумы.

...Як толькі аднавіў работу раённы камітэт партыі, Сцяпан Валько пайшоў туды і здаў партбілет і ўсе дакументы загінуўшых воінаў. Работнікі райкома партыі адшукалі па тых дакументах родных загінуўшых байцоў. Афіцэр быў родам з Саратаўскай вобласці. У лютым 1945-га года Сцяпана Дзмітрыевіча Валька прызвалі ў армію на тэрміновую службу, і ён праслужыў больш сямі гадоў.

Пра ўсе гэтыя падзеі ля вёскі Карпаўцы мне расказалі былая супрацоўніца пасляваеннага райкома партыі Лідзія Паўлаўна Быстрык, жыхары вёскі Ю.Дз.Валько, У.М.Клімчук, В.А.Рамановіч, З.С.Камека, А.В.Вайцюк, а таксама жыхар вёскі Сінькі А.С.Кіслейка.

Аляксей Лушчык, г.п.Вялікая Бераставіца, 2005 год.